Юрыдычная кансультацыя

Каму застанецца кватэра?

Мне было 14 гадоў, калі ў мамы з'явіўся мужчына, які хацеў стаць мужам для яе і бацькам для мяне. З апошняга, на жаль, нічога не атрымалася: я найбольш жыла ў татавай сястры... Не так даўно маёй цётачкі не стала, і цяпер яе родная дачка (пенсіянерка) сцвярджае, што менавіта яна спадчынніца кватэры. Ці так гэта, калі завяшчанне афармлена на мяне?

С. Антонава, г. Мінск.

Як адзначыла **Святлана КОЦІКАВА, натарыус Мінскай гарадской натарыяльнай акругі,** атрыманне спадчыны магчымае па завяшчанні і па законе (калі завяшчанне адсутнічае або вызначае лёс не ўсёй спадчыны). У дадзеным выпадку пляменніца з'яўляецца спадчынніцай па завяшчанні. Родная дачка вашай цёткі, пенсіянерка, з'яўляецца спадчынніцай на абавязковую долю ў сувязі з тым, што закон абараняе інтарэсы непаўналетніх або непрацаздольных дзяцей, бацькоў, сужэнцаў спадчынадаўцы, нават не названых ім у сваім завяшчанні. Яны, незалежна ад зместу гэтага дакумента, маюць права атрымаць не менш як палову долі, якая належала б кожнаму з іх пры атрыманні ў спадчыну па законе (абавязковая доля). Гэта значыць калі ў вашай цётачкі была адна дачка, пры адсутнасці завяшчання яна атрымала б усю кватэру, пры наяўнасці завяшчання (на вашу карысць) — толькі палову.

Спадчына можа быць прынятая на працягу шасці месяцаў з дня адкрыцця спадчыны (дня смерці грамадзяніна). Месцам адкрыцця спадчыны з'яўляецца апошняе месца жыхарства спадчынадаўцы, якое вызначаецца па рэгістрацыі (пры яе адсутнасці — месцы знаходжання) на дзень адкрыцця спадчыны. А калі яно невядомае — па месцы знаходжання нерухомай маёмасці або асноўнай яе часткі, а пры адсутнасці такой — па месцы знаходжання асноўнай часткі рухомай маёмасці.

Для афармлення сваіх спадчынных правоў важна своечасова, да заканчэння шасці месяцаў з дня смерці спадчынадаўцы, звярнуцца да натарыуса па месцы апошняй рэгістрацыі вашай цёткі. На сайце Беларускай натарыяльнай палаты ёсць інфармацыя аб адкрытых (і ў якога з натарыусаў) спадчынных справах. Справа ў тым, што спадчынная справа адкрываецца адна, і ўсе спадчыннікі па ёй звяртаюцца да аднаго натарыуса. То-бок калі па заяве дачкі вашай цёткі ўжо адкрыта спадчынная справа, вам трэба звяртацца да таго ж натарыуса.

Для прыняцця спадчыны вам неабходна асабіста з'явіцца да натарыуса з дакументам, які сведчыць асобу (пашпартам), пасведчаннем аб смерці, завяшчаннем, дакументамі, якія пацвярджаюць прыналежнасць кватэры вашай цётцы і вашы сваяцкія адносіны, даведкай аб апошнім месцы рэгістрацыі спадчынадаўцы. Пры немагчымасці падаць названыя дакументы дастаткова з'явіцца да натарыуса з пашпартам, усе астатнія дакументы будуць запытаны натарыусам.

Магчымае прыняцце спадчыны праз прадстаўніка, калі ў даверанасці спецыяльна прадугледжана паўнамоцтва на яе прыняцце. У такім выпадку да натарыуса будзе звяртацца ваш прадстаўнік з пашпартам і даверанасцю ад вашага імя.

Калі па якіх-небудзь прычынах вы не зможаце асабіста да заканчэння шасці месяцаў з дня смерці вашай цёткі звярнуцца да натарыуса, вам дастаткова па пошце накіраваць натарыусу заяву аб тым, што вы прымаеце спадчыну па завяшчанні. І далей — прозвішча, імя, імя па бацьку, дату смерці і адрас апошняга месца рэгістрацыі вашай цёткі: а таксама свае прозвішча, імя, імя па бацьку, месца жыхарства. Важна, каб пісьмо было даслана да заканчэння шасці месяцаў з дня смерці вашай цёткі. Натарыус зможа па штампе на канверце — даце адпраўкі пісьма — вызначыць, што тэрмін прыняцця спадчыны не прапушчаны.

Парадак вашых далейшых дзеянняў вы зможаце ўзгадніць з натарыусам, які будзе весці спадчынную справу пасля смерці вашай цёткі.

Наш ZOO-гід

МАЯ СЯМ'Я І ІНШЫЯ ЗВЕРЫ,

або Танга з папугаем пад гукі флейты

Калі ваша дзіця марыць завесці папугая, то гэты «заагід» па доглядзе за хатнімі гадаванцамі — якраз тое, што трэба, каб даведацца, як дагаджаць сваёй птушачцы. І тады яна будзе жыць у вас прыпяваючы доўгія гады, бо шмат відаў папугаяў з'яўляюцца рэкардсменамі па працягласці жыцця сярод іншых хатніх гадаванцаў. Канкурэнцыю ў гэтым ім складаюць толькі чарапахі.

Па-першае, трэба ведаць, што свет папугаяў неверагодна багаты на віды і пры выбары хатняга ўлюбёнца важна ўлічваць іх асаблівасці. Жако з Афрыкі — чэмпіён па разумовых здольнасцях, памеру аж да 40 см, з магутнай дзюбай (але заводзіць яго пажадана толькі вопытным уладальнікам, бо птушка бывае агрэсіўнай і патрабуе дрэсіроўкі). Амазоны — лягчэй і нашмат хутчэй сярод іншых навучаюцца, іх можна ў кароткі тэрмін навучыць гаварыць каля сотні слоў. Разелла — вельмі яскравыя, чырвона-сіне-зялёна-жоўтага колеру папугаі — маюць выдатныя вакальныя здольнасці, іх спевы нагадваюць гукі флейты. Ара — сапраўдны прыгажун і самы вялікі, памерам да метра, з добрым інтэлектам, але і самы дарагі, і ўмовы для яго патрэбны адпаведныя. Неразлучнікі, як зразумела з іх назвы, не выносяць адзіноты, гэтых малых памерам да 15 см трэба трымаць парай. Хвалістыя на першым месцы па дружалюбнасці і самыя «гаваркія» з усіх. Яны лягчэй за іншых папугаяў прывыкаюць да людзей, і таму гэта самыя папулярныя гадаванцы.

Дзеля камфортнага пражывання вашага птушынага суразмоўцы важны падыходзячы памер яго жылля. Птушка павінна лёгка і вольна распраўляць свае крылы. Важным крытэрыем з'яўляюцца і параметры клеткі ў даўжыню. Папугаі ж перасоўваюцца больш па гарызанталі, чым па вертыкалі. «Апартаменты» размясціце паводдаль ад электрапрыбораў, скразнякоў, яскравага святла. Не забудзьце і пра інтэрактыўныя цацкі — фуражыроўкі, у якіх схаваны ласунак для любімца. Падбярыце зручныя жэрдкі.

Дзеля доўгага і шчаслівага жыцця свайго Гошы, акрамя гатовых кармавых сумесяў, якія складаюцца з прэсаванага збожжа, абагачайце меню садавіной, агароднінай, зелянінай, уключайце ў яго рацыён кашы, звараныя на вадзе без солі і цукру, свежыя галінкі, прарослы корм. Ваду ў паілцы неабходна змяняць штодзённа.

Ваш хатні любімец мусіць адпачываць 9-10 гадзін, пажадана ў цемры, і, каб не залежаць ад летняга і зімовага часу, лепш за ўсё накрываць клетку цёмнай паветрапранікальнай тканінай. Гэтак вы забяспечыце свайму гадаванцу стабільны рэжым актыўнасці і сну.

Не забывайце пра штодзённую прыборку, мыццё кармушак і паілак.

І памятайце галоўнае! Папугаі — гэта сацыяльныя істоты. Цесная сувязь са сваім гаспадаром — для іх жыццёвая неабходнасць. Калі мы «вырываем» птушку з абдымкаў прыроды і прыносім дадому, фактычна становімся членамі яго зграі. Колькі б ні было ў папугая цацак, гэта ніколі не заменіць паўнацэнных стасункаў з чалавекам. Падрыхтуйцеся прайсці побач са сваім птушыным суразмоўцам амаль усё жыццё, таму што шмат папугаяў жывуць ад 50—70 і да 100 і больш гадоў.

Ала ЖУР.

ЦІКАВЫЯ ФАКТЫ

- У папугаяў выдатна развіта пачуццё рытму — яны могуць танцаваць пад музыку.
- У іх адсутнічаюць галасавыя звязкі, таму гукі птушкі ствараюць з дапамогай языка і дзюбы.
- Шмат папугаяў любяць алкаголь. У прыродзе яны атрымліваюць яго, калі ядуць ягады і садавіну, якія забрадзілі.
- На самай справе папугаі не здольны асэнсавана размаўляць — яны проста запамінаюць і перадаюць словы, а таксама іншыя гукі.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ

КЕКС З РЭВЕНЮ

Спатрэбіцца. Цеста: *густы натуральны ёгурт — 200 мл, алей — 100 мл, лімонны сок — 50 мл, цэдра аднаго лімона, цукар — 250 мл, соль — 0,5 ч. л., яйка — 3 шт., мука — 400 мл, разрыхляльнік — 1 ч. л., сода — 1 ч. л.* ***Начынка:*** *рэвень — 400-500 г (частка пойдзе на ўпрыгожванне дня формы, частка на начынку), цукар — 50 мл і 2 ст. л., лімонны сок — 2 ст. л.* ***Для ўпрыгожвання і падачы:*** *цукровая пудра, мятны цукар, узбітыя вяршкі, натуральны ёгурт ці ядомыя кветкі.*

Для выпякання кекса пажадана прамавугольная форма.

Адправіць у блендар: ёгурт, алей, лімонную цэдру і сок. Узбіць. Дадаць цукар і соль. Узбіць. Дадаць яйкі. Узбіць. Змяшаць паміж сабой муку, соду і разрыхляльнік і дадаць у блендар. Узбіць да поўнага аб'яднання. Адставіць цеста ў блендары ўбок. Нарэзаць рэвень на брусочкі па памеры шырыні дна формы. Кожны брусочак разрэзаць па даўжыні. Выбраць самыя прыгожыя — яны пойдуць на дно (укладваем дно палавінкамі ў адзін пласт). Гэты рэвень пакласці ў міску, дадаць 2 ст. л. лімоннага соку, 2 ст. л. цукру, змяшаць, адставіць убок. Увесь рэвень, які застаўся, нарэзаць на кубікі, дадаць 50 мл цукру, сталовую лыжку вады і праварыць літаральна хвілін пяць. Рэвень павінен стаць мякчэйшы, але не ператварыцца ў кашу. Адкласці ў бок.

Зборка. Выслаць дно формы паперай для выпечкі — так лягчэй перавярнуць гатовы кекс. Бакі формы намазаць маслам і прыпудрыць мукой. Выкласці брусочкі рэвеню на дно прыгожым бокам уніз. Сок, які застаўся, захаваць. Выліць палову цеста. Чайнай лыжкай выкласці палову начынкі (толькі густую частку). Размеркаваць рэшткі цеста і ў апошнюю чаргу рэшткі начынкі (густую частку). Нажом або ручкай лыжкі правесці па цесце змеепадобную лінію, каб начынка перамяшалася з цестам і атрымаўся мармуровы эфект (не зачапіце дна!).

Выпякаць у разагрэтай духоўцы пры 180 °С прыкладна 50 хвілін. Праверка — на сухую палачку.

Астудзіць кекс у форме 10 хвілін. Прайсціся нажом па краях формы, накрыць талеркай і перавярнуць. Акуратна зняць паперу.

Яшчэ цёплы кекс можна паліць рэшткамі соку ад марынавання брусочкаў.

УМЕЛЫЯ РУЧКІ

МАЧАЛКА З ЦЮЛЮ

Гэта мачалка, за якой не прыйдзецца ісці ў краму. Паветраная, у меру мяккая, яна выдатна пеніцца і не дзярэ скуру. Для гэтага замест гладкага цюлю трэба ўзяць ажурны ці з ціснёным малюнкам.

Наразаем цюль на кавалкі памерам 30х40 см, затым складваем яго ўдвая і застрачваем па кароткім боку. Для адной мачалкі спатрэбіцца пяць нарыхтовак. Акрамя гэтага, падрыхтоўваем два кавалачкі шнура даўжынёй 45—50 см.

Выварочваем нарыхтоўкі швом унутр, а затым, таксама ўнутр, запраўляем краі. Кожны шнур складаем удвая і завязваем на канцы вузлом. Па сутнасці, фарміруем пятлю.



Размяшчаем шнур пасярэдзіне пад першай з нарыхтовак вузлом унутр, перахапляем яе пасярэдзіне і зацягваем пятлю. І атрымліваем дзве тунелькі з перамычкай пасярэдзіне.

Наступную нарыхтоўку прапускаем праз абедзве тунелькі адначасова і падцягваем канцы да верху. Атрымліваем наступную пару кольцаў. Зноў прапускаем нарыхтоўку праз кольцы, і так да набору патрэбнай вышыні. Пры неабходнасці чаргуем колеры, каб атрымаць цікавейшы вынік.



У апошнюю пару кольцаў заводзім шнур, а затым зацягваем пятлю.



Практычная мачалка гатовая да выкарыстання. Самараспусканне выключана.

ТАДЫ ДЗЕЎКА СТАЛА ПЫШНА, ЯК ЗАМУЖ ВЫЙШЛА (БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ ПРЫМАЎКА).